УДК 821.161.3-31.09

**Г. В. Навасельцава**
Установа адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава», Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Маскоўскі пр-т, 33, 210038 Віцебск, Рэспубліка Беларусь, +375 (212) 58 49 59, Novoseltseva.anna@mail.ru

# ЖАНР РАМАНА Ў ТВОРЧАСЦІ МІХАСЯ ЗАРЭЦКАГА

В статье рассматривается жанрово-стилевая специфика романа на примере произведений Михася Зарецкого «Сцежкі-дарожкі», «Крывічы», «Вязьмо», литературоведческие оценки которых не однажды существенно корректировались. Анализируется образ главного героя, выражающего морально-этические проблемы своего времени, раскрывается философская система писателя, основанная на утверждении гуманистических ценностей, духовной традиции белорусов. Стиль автора отмечается романтическим пафосом, образностью, эмоциональностью, углубленным психологизмом. Творческие достижения Михася Зарецкого выявились в успешном художественном освоении эпического опыта, отображении обостренного драматического конфликта и раскрытии проникновенного лиризма. Такие произведения, как «Сцежкі-дарожкі», «Вязьмо», существенно повляли на процесс формирования жанра романа в белорусской литературе.

**Ключевые слова:** жанр; роман; главный герой; персонаж; автор; стиль; Михась Зарецкий.
Библиогр.: 5 назв.

**G. V. Navaseltseva**
Vitebsk State P. M. Masherov University, Ministry of Education of the Republic of Belarus, Maskoyski str., 33, 210038 Vitebsk, the Republic of Belarus, +375 (212) 584959, Novoseltseva.anna@mail.ru

# GENRE OF NOVEL IN THE WORKS MIHAS ZARETZKIY

In this article we analyze generic and stylistic novel aspects on the translation of works “Szezhki-darozki”, “Krivichy”, “Vyazmo” by Mihas Zaretzkiy. Literary points of view upon these novels have changed several times. We analyze the figure of the main character who is the symbol of moral and ethical problems of his time, show philosophical writer system, based on traditional and humanistic values. The author style is prominent for romantic spirit, imagery, emotionality and a deep psychology. Creative achievements of Mihas Zaretzkiy were showed through an epic legacy, a difficult conflict and an author lyricism. Such works as “Szezhki-darozki” and “Vyazmo” had a great influence on the form process of this genre in Belarussian literature.

**Key words:** genre; novel; main character; character; author; style; Mihas Zaretzkiy.
Ref.: 5 titles.

**Уводзіны.** У пачатку XX стагоддзя айчыннае прыгожае пісьменства перажывала працэсы паскоранага развіцця, што было абумоўлена вядомымі фактарамі як літаратурнага, так і пазалітаратурнага характару. Так, яшчэ ў крытычным артыкуле «Развагі і думкі» (1914) Максім Гарэцкі, звяртаючыся да пісьменнікаў-сучаснікаў, зазначаў, што беларускаму чытачу неабходна добрая мастацкая проза і, у прыватнасці, добры раман. Майстра слова выдатна разумеў, што існавала грамадская неабходнасць мастацкага асэнсавання ваенных падзей, рэвалюцыйнай рэчаіснасці, і гэта вымагала напісання буйных твораў, у тым ліку раманаў. Менавіта раман дазваляе прасачыць духоўную эвалюцыю асобы, яе ўзаема-адносіны з грамадскім асяроддзем. Гэта жанр, які аказаўся здольным, паводле дадзенага Рольфам Фоксам вобразнага азначэння, «узяць чалавека ў цэлым і выявіць яго».

© Навасельцава Г. В., 2017

Вядомы беларускі літаратуразнаўца А. М. Адамовіч заканамерна заўважае, што дасягненні паэтычнага эпасу былі выкарыстаны празай. У прыватнасці, паэма не толькі пракладвала шлях раману, але і выконвала яго функцыі, пакуль не сфарміраўся празаічны жанр. Даследчык пераканаўча даводзіць, што першы беларускі раман — вершаваны, і гэта знакамітая «Новая зямля» Якуба Коласа. Характарызуючы раман у цэлым, навукоўца слушна падкрэслівае: «Жанр рамана, які найбольш шырока і поўна сінтэзуе ў сабе элементы і перавагі эпасу, драмы і лірыкі, дае асабліва шырокія магчымасці для мастацка-аналітычнага паказу чалавека і грамадска-гістарычнага асяроддзя ва ўсёй іх празаічнай канкрэтнасці і ўнутранай супярэчлівасці» [1, с. 9].

Беларускі даследчык апелюе да тэорыі рамана савецкага вучонага У. Д. Дняпрова, які зазначае, што спалучэнне драмы з эпічным зместам не з'яўляецца механічным працэсам, а кожны раз складае арыгінальную задачу пісьменніка. Так, неабходна пераходзіць ад працэсу адлюстравання мінулага да сцэны, якая адбываецца перад вачыма чытача ўжо ў яго сучаснасці, «суправаджаць дзеянне апісальна-псіхалагічным мастацкім каментарыем, не парушаючы эмацыйнай сілы і захапляльнасці дзеяння» [2, с. 107], спалучыць вобразны элемент рамана з аналітычным. Раман павінен быць эпічна аб'ектыўным і, разам з тым, лірычна суб'ектыўным. Сінтэз эпікі і лірыкі можа адбывацца ў тым ліку праз адлюстраванне акаляючай рэчаіснасці ў працэсе яе пазнання героем, паколькі працэс пазнання заўсёды суб'ектыўны. «Лірыка пазнання», паводле дадзенага У. Д. Дняпровым вобразнага азначэння, пранізвае раман, паколькі з разважанняў вынікае не толькі аналіз падзей, але і асоба аўтара.

Да рамана як наватарскага жанру ў беларускай літаратуры звярнуліся Цішка Гартны, Ядвігін Ш., Міхась Зарэцкі. Аўтары беларускіх раманаў выкарыстоўвалі вопыт паэтычных жанраў, лепшых прыкладаў рускай літаратуры. У 20-я гады ХХ стагоддзя пісьменнікі імкнуліся перааацаніць ролю асобы у грамадстве, акрэсліць спецыфіку ўзаемадзеяння «чалавек—свет» з улікам новых сацыяльных рэалій. Паказвае новага героя — прадстаўніка пралетарыяту ў рамане «Сокі цаліны» Цішка Гартны, дакладней, у першай яго частцы «Бацькава воля» (1916), што найчасцей вызначаецца як аповесць. У творы відавочны ўплыў прозы Максіма Горкага, які сцвярджаў грамадскія заваёвы Кастрычніцкай рэвалюцыі. Беларускі аўтар у рэчышчы рускай літаратурнай традыцыі імкнецца выявіць складаныя ўзаемастасункі грамадска актыўнай асобы са зменлівай сацыяльнай рэчаіснасцю. Тым не менш, аўтарская канцэпцыя «чалавек—грамадства» ў творы не атрымала паслядоўнага паказу. Неадназначныя наступствы рэвалюцыйных падзей патрабавалі значна больш глыбокага асэнсавання, зрэшты, гэтым і абумоўлены працяглы час працы над раманам: яго заключная частка з'явілася ў друку ў 1930 годзе. Няскончаным застаўся раман Ядвігіна Ш. «Золата» (1920), і гэта абумоўлена складанасцю пісьменніцкай задачы: няпроста паказаць лёс пакалення на прыкладзе індывідуальна-асобаснага, калі ў айчыннай літаратуры назапашана недастаткова вопыту ў гэтым жанры.

Паскоранае развіццё прадвызначала тое, што раман на першапачатковым этапе свайго станаўлення выкарыстоўвае мастацкія дасягненні аповесці. Варта зазначыць, што істотны ўплыў на фарміраванне раманнай традыцыі аказалі творы Якуба Коласа — «У палескай глушы» (1922), «У глыбі Палесся» (1927). Невыпадкова, як аўтарытэтна сцвярджае А. М. Адамовіч, калі з'явілася трэцяя кніга, напісаная ў 1948—1954 гадах, аб трылогіі «На ростанях» загаварылі як аб сацыяльна-гістарычным рамане.

**Матэрыял і метады даследавання.** Аб'ектам даследавання выступаюць раманы «Сцежкі-дарожкі», «Вязьмо», «Крывічы» Міхася Зарэцкага, прадметам абрана іх праблемна-тэматычная і жанрава-стылёвая спецыфіка, для вывучэння выкарыстаны культурна-гістарычны, структурна-тыпалагічны метады з элементамі кампаратывістыкі.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Першыя мастацкія прыклады асэнсавання асобы на фоне значных грамадска-сацыяльных працэсаў засведчылі генезіс рамана — складанага і працаёмкага жанру, які патрабуе ад пісьменніка значнага мастацкага вопыту. Калі зыходзіць з прынцыпу храналогіі апублікаваных завершаных твораў, то слушным будзе лічыць першым беларускім раманам «Сцежкі-дарожкі» (1927) Міхася Зарэцкага. Трэба зазначыць, што ацэнка твора, які ўжо мае 90-гадовую гісторыю, не аднойчы пераглядалася крытыкамі і даследчыкамі, у вывучэнне рамана ўносіліся істотныя сэнсавыя карэктывы. Разам з тым, як пераканаўча сцвярджае М. І. Мушынскі, гэты выдатны твор як след не ацэнены і сёння: «Тлумачыцца такое становішча тым, што многія аспекты пастаўленай пісьменнікам праблемы — рэвалюцыя і інтэлігенцыя, шляхі інтэлігенцыі ў рэвалюцыю — доўгі час не прынята было шырока абмяркоўваць» [3, с. 67], больш таго, такія аспекты, як рэвалюцыя і гуманізм, лічыліся паспяхова вырашанымі. Навукоўца акцэнтуе ўвагу на велізарным значэнні, якое адыграў раман «Сцежкі-дарожкі» ў выпрацоўцы нацыянальнага эпічнага вопыту, і, у прыватнасці, вопыту адлюстравання рэвалюцыі. Міхась Зарэцкі ўвасабляе інтэлігента ў першым пакаленні — героя, які адлюстраваны і ў малой прозе пісьменніка, а таксама ў творчасці Максіма Гарэцкага, іншых аўтараў таго перыяду. Як вядома, літаратура шукала і знаходзіла героя новага часу. Паводле сфармуляванага Максімам Горкім эстэтычнага прынцыпу, гэта павінен быць чалавек з народа, які здзяйсняе рэвалюцыйныя змены ў грамадстве і пры гэтым развіваецца сам.

Аўтар у «Сцежках-дарожках» раскрывае маштабны малюнак рэчаіснасці, выяўляе галоўнага героя ў працэсе фарміравання характару, адлюстроўвае асобу ва ўзаемадзеянні з тагачаснымі грамадскімі з’явамі. Раман вызначаецца глыбокім мастацкім псіхалагізмам, на стылёвым узроўні — актыўным выкарыстаннем сродкаў лірычнага самараскрыцця асобы. Знакава, што ўжо ў першым рамане пісьменнікам выразна выяўлена гуманістычная канцэпцыя ўзаемадзеяння чалавека і грамадства, праз духоўныя пошукі героя перададзены працэс назапашвання маральна-этычнага вопыту, неабходнасць якога абумоўлена часам — дзесяцігоддзем паслярэвалюцыйнай рэчаіснасці. Галоўным героем рамана выступае Васіль Лясніцкі, учынкі і меркаванні якога раскрываюцца ва ўзаемадзеянні з яго сябрамі Славіным і Халімам, з рэвалюцыянерам-народнікам Матрунінам, рабочым Андрэем, якія і складаюць мікраасяроддзе твора. У рэчышчы традыцыйнай літаратуразнаўчай інтэрпрэтацыі рамана акцэнтуецца ўвага на развіцці канфлікту паміж Васілём і Андрэем. Напрыклад, А. М. Адамовіч зазначае, што «сюжэтна-псіхалагічны вузел» завязваецца, калі галоўны герой прыязджае на вёску. Так, Лясніцкі шчыра жадае дапамагчы аднавяскоўцам. Прыязджае з горада і Андрэй, «і вось тут выяўляецца, што рабочы Андрэй лепш разумее сялянскія інтарэсы, лягчэй знаходзіць агульную мову з сялянамі, чым іх аднавясковец Лясніцкі. Лясніцкаму здаецца, што Андрэй проста дэмагог, што ён абуджае ў сялянах надзеі, якія ніяк не могуць быць здзейсненымі» [1, с. 143]. Галоўны герой шчыра верыць, што цяпер, з рэвалюцыяй, пачнецца новая праца, шырока распаўсюдзіцца асвета, селянін пачне культурна расці, і таму будучыня за вёскай, а не за горадам. Андрэй імкнецца пераканаць Васіля, што анархія — гэта і ёсць рэвалюцыя, што толькі з анархіі, з разбурэння ўсіх законаў і норм можа вырасці новы парадак. Безумоўна, канфлікт паміж Васілём і Андрэем, а таксама Васілём і яго аднавяскоўцамі, якія спадзяваліся на падтрымку Лясніцкага і расчараваліся, дынамізуе сюжэт твора, надае драматычную завостранасць мастацкаму дзеянню.

Разам з тым варта звярнуць увагу, што галоўны герой паслядоўна паказаны аўтарам пад уплывам гранічна адрозных, нават палярных персанажаў. Лясніцкі па сваім светапоглядзе выступае духоўным спадкаемцам Матруніна, які сцвярджае гуманістычныя ідэалы рэвалюцыі. Вобраз Матруніна ў ачынным літаратуразнаўстве не да канца ацэнены паводле яго глыбіні і знакавасці: як слушна даводзіць М. І. Мушынскі, «нельга сказаць, што герой М. Зарэцкага прадбачыў тут эпоху сталінскіх рэпрэсій, але нельга і не аддаць належнае аўтару рамана, які папярэджваў грамадскасць, абуджаў гуманістычную думку, запрашаў да разваг пра мінулае

і будучыню» [3, с. 76—77]. Сам Лясніцкі шмат разважае, вагаецца і невыпадкова сябруе з такімі рознымі людзьмі: ціхім, добразычлівым Славіным, які па светаадчуванні ўдумлівы філосаф, і анархістам Халімам, які вызнае прынцып змагання дзеля змагання.

Нельга ігнараваць і тое, што вобразы Андрэя і Халімы вызначаюцца істотным падабенствам: героі аспрэчваюць гуманістычныя маральна-этычныя вартасці. Праблемным у рамане бачыцца прачытанне лёсу галоўнага героя, паколькі «адносіны аўтара рамана да Лясніцкага пасля яго размовы з Андрэем змяніліся, і ранейшай паслядоўнай падтрымкі яму з боку пісьменніка ўжо не назіраецца» [3, с. 97]. Міхась Зарэцкі, які выявіў аб'ектыўны малюнак тагачаснай рэчаіснасці, і ў паказе Васіля Лясніцкага застаўся верным жыццёвай праўдзе. Так, у фінале рамана Лясніцкі становіцца камісарам, і гэтаму не даецца псіхалагічнай матывацыі, хоць на працягу твора паслядоўна прасочваецца эмацыйны стан, раскрываецца глыбокі псіхалагічны партрэт героя. Думаецца, тыповай з'явай таго часу было далучэнне прадстаўнікоў інтэлігенцыі да бальшавіцкага руху, адмаўленне ад гуманістычных прынцыпаў, служэнне навязанай ідэалогіі. Мабыць, аўтарская ідэйная задума – у імкненні спасцігнуць трагічны лёс чалавека, паказаць яго ў невырашальных, непераадольных абставінах. Невыпадкова скразным у рамане выступае вобраз сцежак-дарожак, які набывае сімвалічнае гучанне: «Паслаліся перад вачмі бязмежныя сцежкі-дарожкі, пераплялiся пераплётам заклятым — не згадаць, па якой трэба пайсці, каб патрапіць на правільны шлях» [4, с. 162]. Паказальна, што ў «Вязьме» пісьменнік працягне асэнсаванне жыццёвага шляху інтэлігента ў надзвычайных грамадскіх абставінах, па-мастацку акцэнтуе матыў асабістай віны, чалавечай адказнасці за свае ўчынкі, якімі б прычынамі яны не абумоўліваліся.

Сімвалізм паглыбляе філасофскую думку пісьменніка, які сцвярджае значнасць традыцыйных маральна-этычных каштоўнасцяў беларусаў. Аўтар паэтызуе не рэвалюцыйную рэчаіснасць, а звычайнае вясковае жыццё, у прыватнасці, праз мастацкую рэцэпцыю фальклорных матываў і вобразаў: напрыклад, увасабляе Купальскае свята. Тыпалагічна блізка творчай манеры Максіма Гарэцкага выкарыстаны і прыём мастацкага міфалагізму: «І яшчэ добра тады ўпарта ўглядзецца ў спавітыя туманам і змрокам воды Дняпра, увабраць у сябе іх таемнасць маўклівую, сугучную чароўнаму маўчанню чорнага лесу. <…> Тады можа здацца, што рассуваецца ціха туман над Дняпром, раздаецца вада і ўсплывае напаверх цудоўнай красы дзяўчына. <…> Мо гэта русалка. А мо гэта казачная Дзеўка-Паланянка, што ў моры з сонцам купаецца? Мо недзе ўжо сочыць за ёй гарачым вокам шчаслівы Іванька, каб злавіць яе знецікі, каб завесці да злоснага пана?» [4, с. 105]. Вобразнасць, эмацыйная насычанасць твора стварае адметны стыль, які вызначаецца арганічнай спалучанасцю рамантычнага пафасу і мастацкага псіхалагізму.

Шматграннасць стылю Міхася Зарэцкага раскрываецца і ў іншых яго раманах. Гэты жанр ў творчасці пісьменніка прадстаўлены незавершанымі творамі «Крывічы» (1929), «Смерць Андрэя Беразоўскага» (пачатак рамана пад назвай «Рубеж» (1931) публікаваўся ў «Полымі»), а таксама знакамітым «Вязьмом» (1932). У літаратуры 1920-х гадоў раман «Крывічы» вызначаўся наватарскай тэматыкай, у прыватнасці, быў прысвечаны нацыянальна-адраджэнцкаму руху, асэнсаванню яго гістарычнай абумоўленасці. Адносна невялікі фрагмент твора дазваляе меркаваць, што галоўным героем выступае Лявон Камяга, які арыштаваны ў Заходняй Беларусі за рэвалюцыйна-вызваленчую дзейнасць. Камяга ўцякае са зняволяння, што паказана як шчаслівая выпадковасць, і пераходзіць «праз кардон», трапляе ва ўсходнюю, савецкую частку Беларусі. Герой шмат у чым нагадвае рамантычна настроенага, абуджанага узнёслымі думкамі Васіля Лясніцкага. Так, Лявон, калі яму даводзіцца пачуць на вуліцы ад сустрэчных беларускую гутарку, спыняецца, нібы сустрэўшы добрых знаёмых, з вялікім задавальненнем і як мага часцей вымаўляе слова «таварыш», выступае перад аўдыторыяй з эмацыйнай прамовай пра становішча ў Заходняй Беларусі. І тым не менш раман, які вызначаецца глыбокімі псіхалагічнымі рэфлексіямі і вытанчаным лірызмам, сваёй тэматычнай скіраванасцю не адпавядаў ідэалагічным

патрабаванням часу, трагічна паўплываў на творчы лёс пісьменніка. У аўтарскім тлумачэнні да рамана «Рубеж» творца вымушана сцвярджаў, што піша новы раман са старымі героямі, дзеля таго, каб «развеяць туман рамантычнае ідэалізацыі», паказаць персанажы ў іх праўдзівай сутнасці. Раман «Крывічы» быў названы аўтарам «чорнай плямай» ва ўласнай літаратурнай творчасці і шмат у чым тэндэнцыйна ацэньваўся літаратуразнаўцамі нават пасля рэабілітацыі пісьменніка.

Складаная гісторыя даследавання і рамана «Вязьмо». У гэтым творы, які М. І. Мушынскі справядліва называе лепшым як у спадчыне Міхася Зарэцкага, так і ў беларускай літаратуры 1930-х гадоў, аўтар не толькі выявіў гуманістычнае асэнсаванне рэчаіснасці, але і «паставіў пад сумненне неабходнасць суцэльнай калектывізацыі» [3, с. 247]. Пісьменнік, які не мог пратэставаць адкрыта, тым не менш знайшоў мастацкія сродкі для выяўлення сваёй светапогляднай пазіцыі. Вобраз Сымона Карызны не мажліва ацэньваць адназначна. Герой, які створаны ў рэчышчы рамантычнай эстэтыкі, працягвае партрэтную галерэю, дзе па-мастацку ўвасоблены Васіль Лясніцкі, Лявон Камяга і некаторыя іншыя.

Сымон здольны да глыбокіх псіхалагічных самарэфлексій, з якіх вынікае, што перад чытачом складаная і ў нечым трагічная асоба. Так, Карызна — прадстаўнік свайго часу, ён з поўнай шчырасцю галасуе супраць апартуністаў, лічыць іх за здраднікаў і палахліўцаў, «ён нават адчуваў да іх чыста асабістую варожасць, бо ў глыбіні душы, недзе на мяжы свядомасці, насіў невыразную думку ці нават адчуванне, што пералом гэты пэўным чынам вынікае з яго глухога інстынктыўнага незадаволення нэпаўскаю будзёншчынай і азначае зварот да рамантычна-баявых традыцый мінулых дзён» [5, с. 30]. Аднак, нягледзячы на адзначаныя вышэй рысы характару, аўтарам паслядоўна прасочваецца, што герой вагаецца, хвалюецца ад супярэчлівых перажыванняў, імкнецца дайсці да ладу. Сымон вырас у сялянскай сям'і, разумее і шкадуе вяскоўцаў, гэты чалавек, у рэшце, не пазбаўлены звыклай вясковай добразычлівасці, мабыць, з-за гэтага яму надзвычай няпроста выступаць у ролі калектывізатара. Карызна то зацята змагаецца супраць нязгоды вяскоўцаў арганізаваць калгас, то пасіўна спыняецца ў неразуменні, што і як далей рабіць. Паказальна, што ў мікраасяроддзе рамана ўваходзіць вобраз Зелянюка, які сэнсава адцяняе асобу галоўнага героя. Такім чынам пісьменнік выяўляе меркаванне, што лёгка быць добрым арганізатарам і паслядоўным выканаўцам чужому для вёскі чалавеку. Думаецца, што не будзе перабольшваннем сцвярджаць: у рамане «Вязьмо» ў нейкай меры працягваецца матыў пошуку шляху галоўным героем, які быў заяўлены ў першым буйным творы Міхася Зарэцкага. І Сымон Карызна знаходзіць адзіна мажлівы ў тагачаснай рэчаіснасці трагічны шлях, які ўвасабляе Пацяроб. Гэты выбар абумоўлівае і пасіўнае стаўленне да бацькоў, якія патрапілі ў бяду, і жорсткія, часам бесчалавечныя рашэнні, якія прымае сакратар сельсавецкай ячэйкі. Выступае ў нейкай меры сімвалічным, што прымусова створаны калгас узначальвае Андрэй Шыбянкоў, жыццёвая мэта якога — помста за крыўду, а гэта адмаўляе традыцыйныя гуманістычныя каштоўнасці. Адметна і тое, што ідэйна-мастацкі акцэнт прыпадае не столькі на асобу галоўнага героя, колькі на вобраз дзівака Галілея, праз якога аўтар выяўляе ўласную маральна-этычную ацэнку як асобных герояў, так і паказальных з'яў рэчаіснасці.

**Заключэнне.** У беларускай літаратуры адбываўся паскораны працэс засваення на той час наватарскага раманнага жанру, у якім прымаў актыўны ўдзел і Міхась Зарэцкі. Творчыя дасягненні пісьменніка выявіліся ў паспяховым выкарыстанні эпічнага вопыту, адлюстраванні драматычнага канфлікту, увасабленні праніклівага лірызму. У аўтара, які неаднаразова звяртаўся да напісання рамана, сфарміраваўся адметны стыль з выразна выяўленым рамантычным пафасам, паглыбленым псіхалагізмам, вобразнасцю і эмацыйнасцю. У айчынным літаратуразнаўстве ацэнкі «Сцежак-дарожак», «Крывічоў», «Вязьма» неаднаразова істотна карэктаваліся, і неадназначнае прачытанне даследчыкамі выступае паказчыкам шматзначнасці, філасофскай глыбіні твораў. Міхась Зарэцкі, які

ўвасабляе рэвалюцыйную рэчаіснасць, паслядоўна сцвярджае вартасць гуманістычных каштоўнасцяў, звяртаецца да маральна-этычнай спадчыны беларусаў. Пісьменнік не пярэчыць гістарычнай праўдзе, паказваючы галоўным героем тыповага прадстаўніка свайго часу, а таксама глыбока асэнсоўвае канфлікт «чалавек — грамадства», акцэнтуе ўвагу на трагічным лёсе асобы. Аўтар напісаў высокамастацкія творы, у прыватнасці, яго завершаныя раманы «Сцежкі-дарожкі», «Вязьмо» істотна паўплывалі на працэс фарміравання жанру ў нацыянальным прыгожым пісьменстве.

## Спіс цытаваных крыніц

1. *Адамовіч, А. М.* Беларускі раман. Станаўленне жанра / А. М. Адамовіч. — Мінск : Выд-ва БССР, 1961. — 293 с.
2. *Днепров, В. Д.* Идеи времени и формы времени / В. Д. Днепров. — Л. : Совет. писатель, 1980. — 598 с.
3. *Мушынскі, М. І.* Праўдзівая гісторыя жыцця і творчасці Міхася Зарэцкага / М. І. Мушынскі. — Мінск : Беларус. навука, 2005. — 340 с.
4. *Зарэцкі, М.* Збор твораў : у 4 т. / М. Зарэцкі. — Мінск : Маст. літ., 1989—1992. — Т. 2. Голы звер : аповесць. Сцежкі-дарожкі : раман. — 1990. — 414 с.
5. *Зарэцкі, М.* Збор твораў : у 4 т. / М. Зарэцкі. — Мінск : Маст. літ., 1989—1992. — Т. 3. Вязьмо : раман. Сымон Карызна : драм. аповесць. — 1991. — 375 с.

Поступила в редакцию 22.12.2016